**ДУК “ Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк”**

**2023**

**Сакавік**

# Бібліятэчны веснік














**Інфармацыйны веснік**

# *Сакавік*

3

Генеральная Асамблея ААН у 1987 годзе абвясціла 1 сакавіка Міжнародным днём барацьбы з наркаманіяй і незаконным абаротам наркотыкаў, вызначыўшы тым самым усю важнасць праблемы. У гэты дзень у бібліятэках Гарадоцкай сеткі вялі гутарку аб гэтай глабальнай пагрозе.

**1 сакавіка** ў чытальнай зале **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы** прайшла **пазнавальна-прафілактычная гутарка "Город без наркотиков", да Міжнароднага Дня барацьбы з наркаманіяй і наркабізнесам.** Падчас мерапрыемства падлеткі праглядзелі відэапрэзентацыю аб прафілактыцы нарказалежнасці, даведаліся, што такое наркаманія і як зберагчы сябе і сваіх блізкіх. Размова ішла аб наступствах ужывання наркотыкаў, узаемасувязі наркаманіі і злачыннасці. А таксама школьнікам расказалі пра знакамітых людзей, якія памерлі або лячыліся ад наркатычнай залежнасці. Удзельнікі мерапрыемства актыўна ўдзельнічалі ў абмеркаванні, адказвалі на пытанні: "Аб спосабах сказаць "НЕ", "Якім я хачу бачыць сваё жыццё?", "Што я гатовы для гэтага зрабіць?". Дзеці зразумелі, што чалавек, які ўжывае наркотыкі, ужо ніколі не стане ранейшым. Бібліятэкар заклікала моладзь, абапіраючыся на актыўную жыццёвую пазіцыю, жывыя зносіны з аднагодкамі, выбіраць жыццё, берагчы сваё здароўе, весці здаровы лад жыцця, вучыцца супрацьстаяць цяжкасцям і ў цяжкіх жыццёвых сітуацыях умець карыстацца тэлефонамі даверу. У фае бібліятэкі была аформлена кніжная выстава "**Наркотическая опасность**".





**1 сакавіка** гадзіна карыснай інфармацыі "**Жизнь прекрасна – не губи её**", да Міжнароднага Дня барацьбы з наркаманіяй і наркабізнесам прайшла **ў Бычыхінскай сельскай бібліятэцы** для моладзі. Падчас дыялогу навучэнцы падзяліліся сваімі марамі аб шчасці, вучобе і згадзіліся, што для выканання мары ім неабходна моцнае здароўе, а наркатычная залежнасць – не для іх.

**1 сакавіка** да Міжнароднага Дня барацьбы з наркаманіяй і наркабізнесам для дзяцей і падлеткаў у **Сцяпанавіцкай сельскай бібліятэцы** прайшла **інфармацыйная гадзіна “Это важно знать”.** На мерапрыемстве размова ішла аб наркаманіі, аб прычынах яе распаўсюджвання, і якую шкоду здароўю чалавека, асабліва малодому, наносяць наркатычныя прэпараты. Таксама акцэнт быў зделан на тое, што правільныя паводзіны і здаровы лад жыцця дапамагаюць пазбегнуць гэтай небяспекі.

**“Иллюзия с чёрным окрасом”** – пад такой назвай да Міжнароднага Дня барацьбы з наркаманіяй і наркабізнесам прайшоў для падлеткаў **урок-папярэджанне** ў **Верамееўскай сельскай бібліятэцы**. Размова на мерапрыемстве ішла аб тым, што ўсё, што могуць даць наркотыкі чалавеку, гэта зло, якое прывядзе да залежнасці, хвароб і смерці, а таксама прычыніць велізарнае гора блізкім людзям.




**1 сакавіка** да Міжнароднага дня барацьбы са злоўжываннем наркатычнымі сродкамі і іх незаконным абаротам наркотыкаў у **Межанскай бібліятэцы-клубе** прайшла **гадзіна разважання** “**Ключ в долину смерти**” для навучэнцаў 3-4 класаў ДУА “Мяжанская сярэдняя школа імя А.Я. Казлова”. Бібліятэкар расказала прысутным, што ў дом, дзе з'яўляюцца наркаманы, заўсёды прыходзіць страшная бяда. Тут ужо ніколі не будзе весялосці і дабрыні – толькі гора і слёзы.

З 1 сакавіка да Міжнароднага Дня барацьбы з наркаманіяй і наркабізнесам у **Даўгапольскай сельскай бібліятэцы** была аформлена **кніжная выстава “Жизнь без наркотиков ярче**”. На выставе прадстаўлены буклеты, кнігі, выразкі з газет, у якіх знаходзіцца інфармацыя аб першых прыкметах ужывання наркотыкаў, а таксама аб тым, як зберагчы родных і блізкіх людзей ад наркатычнай залежнасці. У **Пальмінскай сельскай бібліятэцы** чытачы мелі магчымасць пазнаёміцца з **кніжнай выставай** “**Опасно – наркотик!**”. Тут знаходзіліся кнігі і буклеты, прысвечаныя праблеме наркаманіі, як глабальнай пагрозе здароўю насельніцтва краіны і нацыянальнай бяспецы, прафілактыцы і барацьбе з гэтай страшнай хваробай.





**3 сакавіка** супрацоўнікі **аддзела дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** падрыхтавалі і правялі для вучняў першых класаў ДУА "Сярэдняя школа №1 г. Гарадка ім. І. Х. Баграмяна" **экскурсію па бібліятэцы "Путешествие в Королевство Книг".** Школьнікі ў гульнявой форме даведаліся што ў бібліятэцы існуюць дзве залы для чытачоў: абанемент і чытальная зала, што кнігі растаўлены на стэлажах у пэўным парадку, паслухалі аб правілах паводзін у бібліятэцы і як трэба беражліва ставіцца да ўзятых дадому кніг. Затым дзеці выбралі сабе кнігі на абанеменце для хатняга чытання.





**3 сакавіка ў Дубраўскай сельскай бібліятэцы прайшла конкурсна-гульнявая праграма "Урожайная корзинка"** для навучэнцаў пачатковых класаў ДУА "Вышадская сярэдняя школа імя М.І.Гапеёнка". Падчас мерапрыемства дзеці папоўнілі свае веды аб агароднінных культурах, іх разнастайнасці і карыснасці для арганізма чалавека. Ўсе весела і актыўна ўдзельнічалі ў тэматычных гульнях, конкурсах, віктарынах.

**3 сакавіка** супрацоўнік **Бычыхінскай сельскай бібліятэкі** правяла для малодшых школьнікаў ДУА "Бычыхінская сярэдняя школа ім. І.М. Антонава" **экалагічную гульню "Природа – наш дом"**. Дзеці гулялі ў гульні, адказвалі на пытання віктарыны аб навакольным асяроддзі.

**4 сакавіка ў Прудніцкай сельскай бібліятэцы** для маленькіх чытачоў прайшла **інфармацыйная гадзіна "Масленіца годовая – наша госцейка дорогая".** Бібліятэкар расказала аб кожным дне масленічнага тыдня, аб абрадах і традыцыях гэтага народнага свята. І вядома пра галоўны яе атрыбут – бляны. А каб у прысутных было поўнае ўяўленне аб свяце, бібліятэкар арганізавала наведванне свята Масленіца ў ТАК "Лосвіда". Дзеці прынялі актыўны ўдзел у гульнях і забавах.



Міжнародны жаночы дзень – гэтае свята вясны, жаночай прыгажосці, пяшчоты і ўвагі да жанчын. Бібліятэкары Гарадоцкай сеткі бібліятэк у гонар свята праводзілі мерапрыемствы, дорачы сваім чытачам добры настрой і цеплыню.

Напярэдадні Міжнародны жаночага дня бібліятэкар **Межанскай бібліятэкі-клуба** запрасіла маленькіх чытачоў каб падрыхтаваць **відэа-віншаванне “Подари улыбку маме”.** Дзеці чыталі вершы, аб любімых матулях і запісалі відэа, якое было размешчана на афіцыйнай старонке бібліятэкі-клуба.












**5 сакавіка ў Верамееўскай сельскай бібліятэцы** прайшла **гадзіна дзіцячай творчасці “Любовь и мама всегда рядом”.** Дзеці разам з бібліятэкарам вялі размову аб тым, што у кожнай мамы ёсць самая запаветная шкатулка або скрыначка, якую яна беражліва захоўвае. Гэта малюнкі, аплікацыі, цыдулкі, зробленыя рукамі яе дзяцей. Дзеці разглядалі часопісы, дзе апісваецца як зрабіць віншавальныя паштоўкі да Міжнароднага жаночага дня і зрабілі падарункі сваім каханым мамам. Напрыканцы мерапрыемства была аформлена выстава.

Чарговае паседжанне клуба “Надежда”, які існуе пры Верамееўскай сельскай бібліятэцы, было прымеркавана да Міжнароднага жаночага дня. “Клубнікі” сабраліся на музычна-паэтычную гадзіну “Быть женщиной великое искусство”. Мерапрыемства прайшло ў вясёлай святочнай атмасферы. Удзельнікі чыталі вершы, сталі ўдзельнікамі ў тэтралізаванай сцэнцы-экспромце, заслухалі кветкавы гараскоп, пагаварылі аб вясновых прыкметах. Завяршылася мерапрыемства чаяваннем і рэтра-танцамі.



**Вясенні балаганчык “В марте есть такой денек”** быў арганізаваны для навучэнцаў 5 класа ДУА “Езярышчанская сярэдняя школа імя П. Э. Анціпава” да Міжнароднага жаночага дня **6 сакавіка** бібліятэкарамі **Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэкі.** Падзяліўшыся на дзве каманды дзеці выконвалі мноства вясёлых заданняў і конкурсаў: хто хутчэй ачысціць яблык, прышые гузік, зробіць кветку з паперы, вызначыць па інгрыдыентах страву, намалюе смайлік. Асабліва парадаваў конкурс "Наряди сестренку", у якім ролю сястрычкі гулялі хлапчукі. А скончыўся балаганчык запальным конкурсам танцаў.








**7 сакавіка** ў **Дубраўскай сельскай бібліятэцы** быў арганізаваны **конкурс чытальнікаў вершаў “Для тебя,моя милая мама!**”, прымеркаваны да Міжнароднага жаночага дня. Дзеці сабраліся каб яшчэ раз расказаць пра сваіх маці і прачытаць вершы прысвечаныя свайму самаму роднаму і любімому чалавеку.

Да Дня жанчын у **Віраўлянскай сельскай бібліятэцы** была аформлена **выстава-віншаванне “Ах, эта женщина-загадка”.**



Да Міжнароднага жаночага дня **супрацоўнікі Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі падрыхтавалі святочную акцыю “Самым милым и любимым”.** Мэта акцыі – павіншаваць чытачак з надыходзячым жаночым святам, стварыць добры настрой. Таксама была афармлена выстава-віншаванне “Пра жанчыну з любоўю”.



**7 сакавіка ў Прудніцкай сельскай бібліятэцы** была афармлена **літаратурна-музычная выстава “Всё для тебя”**, прымеркаваная да Міжнароднага жаночага дня. На выставе былі прадстаўлены самыя лепшыя кнігі аб каханні і віншавальныя паштоўкі розных гадоў. А таксама на працягу дня гучала музыка.



Супрацоўнікі Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі прынялі ўдзел у спартыўным свяце “**Витебская лыжня – 2023**”, які праходзіў у Вараб'ёвых гарах. Была афармлена бібліятэчная выстава “**О спорт, ты мир!**”, тэматычная фотазона.







**9 сакавіка** ў рамках праекта “Чытаем разам па-беларуску” у **аддзеле дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** прайшло **фальклорнае свята “Сустракаем вясну-красну”.** На мерапрыемства запрасілі выхаванцаў ДУА “Яслі-сад №2 г. Гарадка”. Вясна прыйшла не з пустымі рукамі, а з поўным кошыкам вясновых загадак, казак, вершаў, гульняў. Дзеці знаёміліся з прыметамі вясны, з птушкамі, што на крылах вясну нясуць, з яркімі першымі кветкамі. Вельмі спадабаліся рабятам гульні “Грачы ляцяць”, “Разбудзі мядзведзя”, “Збяром вясновы букет”. У канцы мерапрыемства маленькія наведвальнікі паглядзелі **лялечны спектакль “Як звяры Вясну сустракалі”.**

**12 сакавіка** бібліятэкар **Прудніцкай сельскай бібліятэкі** запрасіла маленькіх чытачоў на **гадзіну здароўя “Ты на горке не зевай, а здоровье укрепляй!”.** Мерапрымства пачалося з размовы аб зімніх відах спорту. А затым усе разам адправіліся катацца на горцы.

14 сакавіка ва ўсіх епархіях Рускай Праваслаўнай Царквы адзначаюць Дзень праваслаўнай кнігі, які праводзіцца для прыцягнення цікавасці да праваслаўных кніг і ўвасабляе прызнанне вялікага значэння духоўнай літаратуры ў маральным выхаванні людзей, далучэнні іх да хрысціянскіх традыцый. Да гэтай даты штогод у бібліятэках Гарадоцкай сеткі праходзяць тэматычныя мерапрыемствы.



**14 сакавіка** каб адзначыць Дзень праваслаўнай кнігі ў **Бычыхінскай сельскай бібліятэцы** сабраліся ўдзельнікі дзіцячага клуба “Истоки”, дзе для прысутных адбыўся **агляд кніжнай выставы “Свет добра из–под обложки”.**

Тэмай чарговага паседжання клуба “Святліца”, які існуе пры **Верхоўскай сельскай бібліятэцы** для жанчын пенсіённага ўзросту, стала размова аб праваслаўных кнігах. Прайшла **гадзіна адпачынку “Аб Боге, вере, истине, красоте, добре и надежде”,** прымеркаваная да Дня праваслаўнай кнігі.

У сакавіку да юбілея дзіцячага паэта і пісьменніка С.У. Міхалкова ў бібліятэках Гарадоцкай сеткі прайшлі мерапрыемства і выставы.

Эмацыянальным і інфармацыйна насычаным стала чарговае пасяджэнне клуба “Любазнайка”, якое адбылося **10 сакавіка ў Пальмінскай сельскай бібліятэцы– літаратурная гульня “В гостях у С. Михалкова”.** Клубнікі пачулі цікавыя факты з жыцця і творчасці паэта, успомнілі яго творы, адказалі на пытанні віктарыны.

**15 сакавіка ў Вiраўлянскай сельскай бібліятэцы** прайшлі **гучныя чытанні вершаў “Путешествия по веселым стихам Михалкова”**, прысвечаныя 110-годдзю з дня нараджэння паэта і пісьменніка С.Міхалкова. Разам з бібліятэкарам дзеці адправіліся ў падарожжа па любімых творах гэтага цудоўнага паэта. Для прысутных прагучалі вершы, таксама дзеці адказалі на пытанні віктарыны. Напрыканцы бібліятэкар нагадала ўдзельнікам мерапрыемства, што сённяшняе вандраванне завяршылася, але іх сяброўства з С.В.Міхалковым не скончыцца калі яны будуць і далей чытаць яго сагрэтыя дабром і гумарам кнігі.







**17 марта ў Межанскай бібліятэцы-клубе** адбылося завочнае **знаёмства** самых маленькіх чытачоў **з пісьменнікам “Для вас девчонки и мальчишки писал он эти книжки”,** прымеркаванае да 110 годдзя С.У. Міхалкова.



15 сакавіка – Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Да гэтай значнай даты ва ўсіх бібліятэках сеткі прайшлі мерапрыемствы.



Дню Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь быў прысвечаны прававы ўрок “**Основной Закон Государства: Права, Гарантии и Защита”**, які прайшоў у чытальнай зале **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы** з удзельнікамі клуба “Правовед” **15 сакавіка**. Дзеці пазнаёміліся з гісторыяй узнікнення і развіцця канстытуцыйнага права ў нашай рэспубліцы, пазнаёміліся са структурай Канстытуцыі, яе асноўнымі раздзеламі. Бібліятэкар расказала аб значэнні Канстытуцыі для дзяржавы ў цэлым і для кожнага грамадзяніна нашай рэспублікі. Акрамя гэтага, школьнікі пазнаёміліся з гісторыяй стварэння першай Канстытуцыі – Статута 1588 Вялікага Княства Літоўскага. Супрацоўнік бібліятэкі падкрэсліла важнасць увасаблення на практыцы закладзеных у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь каштоўнасцей, нацыянальнага адзінства і беражлівых адносін да гістарычнай і культурнай спадчыны кожным грамадзянінам нашай краіны. Бібліятэкар пазнаёміла дзяцей з асноўнымі правамі і абавязкамі грамадзяніна, а затым удзельнікі, скарыстаўшыся атрыманымі ведамі, прынялі ўдзел у тэматычнай віктарыне “Я гражданин своей страны!” і пазнаёміліся з **кніжнай выставай “Конституция – символ эпохи”.**

**15 сакавіка** ў **Межанскай бібліятэцы-клубе** для навучэнцаў малодшых класаў ДУА “Межанскі дзіцячы сад-сярэдняя школа імя А.Я. Казлова”, было арганізавана **“Путешествие в страну Правознайка”** да Дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Дзеці пабывалі на станцы “Гістарычная”, дзе пазнаёміліся з гісторыяй узнікнення нашай дзяржавы і яе асноўнага закона. Затым адправіліся на станцыю “Прававая”, дзе азнаёміліся са сваімі правамі і абавязкамі. Завяршылася падарожжа на станцы “Заканадаўчая”, дзе ўсе разам даведаліся, што такое закон і адказнасць.



**Інфарміна “Конституция – символ эпохи”** прайшла **15 сакавіка ў Бычыхінскай сельскай бібліятэцы** для вучняў старэйшых классаў ДУА “Бычыхінская сярэдняя школа ім. І.М. Антонава”. На мерапрыемстве вучні даведаліся аб узнікненні першай Канстытуцыі ў свеце, Беларусі, аб тым, што прапановы аб зменах у сучасны асноўны закон нашай краіны мог унесці кожны жадаючы.



Да Дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у **Дубраўскай сельскай бібліятэцы** для вучняў старэйшых класаў ДУА "Вышадская сярэдняя школа імя М.І.Гапеёнка" прайшоў **урок прававой граматнасці "Я гражданин Рэспублікі Беларусь"**. У рамках мерапрыемства прайшла віктарына, гутарка аб правах і абавязках падлеткаў, агляд прававой літаратуры.



Да Дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у Даўгапольскай сельскай бібліятэцы была афармлена кніжная выстава "Основной закон страны", на якую бібліятэкар звяртала ўвагу карыстальнікаў.



**15 сакавіка ў Пальмінскай сельскай бібліятэцы** прайшла **інфармацыйная гадзіна "Конституция государства – фундамент государственного строительства"**. Падчас мерапрыемства бібліятэкары нагадалі ўсім прысутным, што такое Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, калі яна была прынята, што абвяшчае. Далей расказалі пра сімвалы дзяржавы: Гімн, Сцяг і Герб, праслухалі запіс дзяржаўнага Гімна Рэспублікі Беларусь. Да мерапрыемства была падрыхтавана **кніжная выстава-знаёмства "Права и я".**

**17 сакавіка** бібліятэкар чытальнай залы **аддзела дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** разам з навучэнцамі 2-га класа ДУА "Сярэдняя школа №1 г. Гарадка ім. І. Х. Баграмяна" адправіліся ў **казачнае падарожжа па кнігах Г.Х.Андэрсана "Сказочник Датского королевства".** Пасля знаёмства з біяграфіяй і творчасцю пісьменніка, дзе юныя вандроўнікі даведаліся шмат цікавых і пазнавальных фактаў з жыцця вялікага казачніка, усе прынялі актыўны ўдзел у вясёлых гульнях і конкурсах: "Принцесса на горошине", "Музыкальные стулья", "Кто живёт на птичьем дворе", "И я сочиняю сказку". Таксама дзеці актыўна адказвалі на пытанні віктарыны "Звёздный час", адгадвалі загадкі па казках пісьменніка-казачніка. У чытальнай зале ў гэты дзень можна было пазнаёміцца з кніжнай выставай "Волшебная страна Андерсена", пагартаць старонкі любімых казак або ўзяць кнігу дадому. Дзеці з задавальненнем пабывалі ў краіне цудаў Андэрсана.

**19 сакавіка ў Пальмінскай сельскай бібліятэцы прайшоў экачас “Сохраним нашу планету”,** галоўная мэта мерапрыемства – прыцягнуць увагу удзельнікаў да беражлівых і правільных адносін да роднай прыроды.

**21 сакавіка** ў літаратурна-музычнай гасцёўні **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** прайшоў **семінар бібліятэчных работнікаў** “**Духовное наследие в книгах и чтении**”. У мерапрыемстве прыняла ўдзел начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мазжарава С. В. з пытаннем “Заканадаўства Рэспублікі Беларусь у галіне рэлігіі”. З цікавасцю прысутныя праслухалі даклад протаіерэя Уладзіміра Дагодзька і святара Вячаслава пра рэлігійную літаратуру і яе змест. Бібліятэкары расказалі аб супрацоўніцтве бібліятэкі з Гарадоцкім благачыннем на базе Кафедры праваслаўнай літаратуры ў цэнтральнай бібліятэцы, правядзенні сумесных мерапрыемстваў па духоўна-маральным выхаванні дзяцей і моладзі. Загадчык аддзела маркетынгу Людміла Зайцава расказала пра арганізацыю выставачнай дзейнасці праваслаўнай тэматыкі на базе бібліятэк сеткі і магчымасці карыстацца інфармацыяй, размешчанай на сайтах Гарадоцкай сеткі публічных бібліятэк, Віцебскай Епархіі, Гарадоцкага благачыння. Была аформлена выстава кніг з фонду храма Святой Жываначальнай Тройцы. Тут можна было ўбачыць кнігі як сучасныя, так і першай паловы 19 стагоддзя, якія прыцягнулі асаблівую ўвагу прысутных. Таксама была аформлена выстава друкаванай прадукцыі аддзела бібліятэчнага маркетынгу “Православные праздники”. Да семінара быў распрацаваны буклет “Православные интернет-ресурсы”.





**21 сакавіка ў Сцяпанавіцкай сельскай бібліятэцы** была аформлена **выстава-натхненне “Поэзии мир необъятный”,** прымеркаваная да Сусветнага дня паэзіі. Прадстаўленыя на выставе кнігі М. Цвятаевай, Ф. Цютчева, С. Есеніна, А. Ахматавай, і другіх паэтаў акунулі чытачоў у цудоўны свет паэзіі.

22 сакавіка 2023 года спаўняецца 80 гадоў з дня жудаснай трагедыі, якая адбылася ў Хатыні. Да гэтай падзеі ў бібліятэках сеткі адбыўся шэраг мерапрыемстваў.




**«О чём звонят колокола Хатыни…»** – пад такой назвай прайшла **літаратурна-музычная кампазіцыя**, прысвечаная 80-годдзю Хатынскай трагедыі ў літаратурна-музычнай гасцёўні Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі **22 сакавіка**. На мерапрыемства былі запрошаны навучэнцы старэйшых класаў школ горада. Прысутныя даведаліся пра жудасныя падзеі, якія напаткалі жыхароў беларускіх вёсак, знішчаных нацыстамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Дзеці пачулі аповед пра тое, як развіваліся падзеі таго дня, хто застаўся ў жывых і як склаўся іх лёс. Быў паказаны відэаролік пра мемарыяльны комплекс “Хатынь”, створаны як даніна памяці загінуўшым жыхарам вёскі. Аб трагедыі напісана нямала кніг. З некаторымі з іх можна было пазнаёміцца на **выставе “Хатынь – тое, што не забыць нам ніколі”** і з агляду літаратуры, які падрыхтавала і правяла бібліятэкар Банадысева К.А. Навучэнцы ДУА “Дзіцячая школа мастацтваў г. Гарадка” выступілі з музычнымі нумарамі.



**22 сакавіка ў Бычыхінскай сельскай бібліятэцы** для школьнікаў 7-8 класаў ДУА “Бычыхінская сярэдняя школа ім. І.М. Антонава” прайшла **гадзіна гісторыі “Хатынь. Трагедия. Память”.** Бібліятэкары расказалі аб трагедыі, якая прайшла ў гады Вялікай Айчынай вайны ў вёске Хатынь. Да мерапрыемства была падрыхтавана **выстава-памяць “Пепел Хатыни в сердца нам стучится”.**







**22 сакавіка ў Пальмінскай сельскай бібліятэцы** прайшла **бібліятэчная гадзіна “Хатынь: символ вечной памяти и трагедии белорусского народа”.** На мерапрыемстве прысутныя пазнаёміліся з трагедыяй беларускай вёскі, знішчанай фашыстамі ў 1943 годзе.





Да 80-годдзя знішчэння беларускай вёскі Хатынь ў **Вархоўскай сельскай бібліятэцы** прайшла **гадзіна памяці “Место, пропитаное скорбью”.** На мерапрыемстве прысутнічалі дзеці рознага ўзросту. Яны даведаліся аб Хатынскай трагедыі, якая адлюстроўвае ўсю трагедыю беларускага народу.

**25 сакавіка** ў **Сцяпанавіцкай сельскай бібліятэцы** быў праведзены **ўрок гістарычнай памяці “Колокола Хатыни”,** прымеркаваны да Дня Хатынскай трагедыі. Падчас мерапрыемства дзеці пачулі аповед, як адбываліся падзеі ў вёске Хатынь ў той дзень 22 сакавіка 1943 года, хто з жыхарой застаўся жывы, і як далей склаўся іх лёс. Пазнаёміліся з гісторыяй стварэння мемарыяльнага комплексу “Хатынь”, пра тое што Хатынь з’яўляецца ўвасабленнем некалькіх соцень беларускіх вёсак, спаленых у гады вайны разам з жыхарамі.

**22 сакавіка** ў рамках работы праекта “Писатели и поэты родного края” у чытальнай зале **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы** на паэтычны **зоркапад “Любимые строки в День поэзии”**, прысвечаны Сусветнаму дню паэзіі, сабраліся паэты-аматары і жыхары горада, якія любяць і шануюць вершаванае слова. Ганаровым госцем мерапрыемства стала Н.У. Саветная – член Саюзаў пісьменнікаў Беларусі, Расіі, Саюзнай дзяржавы, паэт, публіцыст, празаік, грамадскі дзеяч, кандыдат псіхалагічных навук. Мерапрыемства прайшло ў лёгкім нязмушаным становішчы, дзе кожны з задавальненнем дзяліўся сваёй творчасцю. Бібліятэкар прапанавала прысутным прыняць удзел у раённым мабільным праекце “Паэтычны маршрут”, у рамках якога запіс вершаў у выкананні паэтаў-землякоў будуць трансліравацца на маршрутах бібліобуса. На мерапрыемстве таксама прысутнічалі госці – старшыня, члены Гарадоцкай раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання “Беларускае аб'яднанне інвалідаў”.



**22 сакавіка** бібліятэкары **Езерышчанскай гарпасялковай бібліятэцы** сумесна з супрацоўнікамі цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці філіял “Езярышчанскі ГПДК” арганізавалі і правялі **гульню-фантазію “Поиграем в сказку”,** якая была арганізавана для навучэнцаў 1-2 класаў ДУА “Езярышчанская сярэдняя школа імя П. Э. Анціпава” і прымеркавана да Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі. Да дзяцей у гэты дзень завітала ў госці Васіліса Прамудрая, якая разам з бібліятэкарамі прапанавала прысутным шмат вясёлых конкурсаў. Удзельнікі збіралі з пазлаў казачных герояў, адказвалі на пытанні віктарыны і інш. Напрыканцы мерапрыемства ўсе атрымалі салодкія прызы.




**22 сакавіка** для маленькіх выхаванцаў ДУА “Яслі-сад №1 г. Гарадка” у чытальнай зале супрацоўнікі **аддзела дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** правялі **пазнавальна-гульнявую праграму “Лес полон чудес”,** прымеркаваную да Сусветнага дня аховы лясоў. Спачатку дзеці ў гульнявой форме даведаліся пра правілы паводзін у лесе і атрымалі элементарныя веды аб лясной экасістэме. А потым усе прысутныя адправіліся ў экалагічнае падарожжа. Падчас падарожжа дзеці наведалі станцыі : “Если я приду в лесок”, “На лесной опушке”, “Лесная аптека”, “Зверьё моё”, “Цветочная поляна”, “Деревья”. Там удзельнікі адгадвалі лясныя загадкі, гулялі ў вясёлыя гульні “Поможем полянке”, “Грибное лукошко”, “Мишка косолапый”. А дзякуючы выставе “Кто в лесу живёт? Что в лесу растёт?”, яны пазнаёміліся з даведачнай літаратурай, якая расказвае пра расліны і жывёл беларускіх лясоў. Прыемным сюрпрызам для ўдзельнікаў стаў паказ **лялечнага спектакля “Подарок для Солнышка”.**





**23 сакавіка** ў **Пальмінскай сельскай бібліятэцы** прайшоў **урок мужнасці па творчасці Міхаіла Савіцкага “Узника глазами – душой художника”.** На мерапрыемстве бібліятэкары распавялі не толькі пра цяжкі лёс таленавітага мастака, але і прадэманстравалі рэпрадукцыі яго карцін з кнігі Э. Пугачова “Михаил Савицкий”. Таксама дзеці даведаліся, што імя Міхаіла Савіцкага ўнесена ў гісторыю айчыннага жывапісу, у мастака нямала тытулаў і ўзнагарод.

У рамках Тыдня дзіцячай кнігі ў **Прудніцкай сельскай бібліятэцы** прайшло шмат цікавых мерапрыемстваў для маленькіх чытачоў. **25 сакавіка** дзеці былі запрошаны на **бенефіс пісьменніка “Волшебные сказки Андерсена”.** Спачатку бібліятэкар расказала прысутным аб вялікім казачніке, яго жыцці і творах. А затым дзеці самі па падказкам знайшлі казкі на полках ў бібліятэцы. **26 сакавіка** прайшоў **агляд літаратуры “Пісателі детям”.** Прысутныя пазнаёміліся з навінкамі літаратуры, якая паступіла ў бібліятэку. Таксама была аформлена **выстава-прынада “Я ў свеце ўсіх цікавей”**. **30 сакавіка ў Прудніцкай сельскай бібліятэцы** адбылося сапраўднае шахматнае спаборніцтва – **гадзіна гульні “Юные гроссмейстеры”.**



**28 сакавіка** ўдзельнікі клуба “Почемучки” прыйшлі ў **Верамееўскую сельскую бібліятэку на эрудыт-кафэ “Что? Где? Почему?”.** Дзеці адказвалі на пытанні бібліятэкара па розных тэмах, даведаліся шмат новых цікавых фактаў аб навакольным асяроддзі.




**28 сакавіка ў Бычыхінскай сельскай бібліятэцы** для школьнікаў 7-8 класаў ДУА “Бычыхінская сярэдняя школа ім. І.М. Антонава” прайшла **экскурсія па творчасці пісьменніка “Знакомство с классиком”** да 155-годдзя з дня нараджэння М. Горкага. Бібліятэкары пазнаёмілі прысутных з жыццём і творчасццю рускага пісьменніка.



**28 сакавіка** ўдзельнікі клуба “Добрые встречи” былі запрошаны ў **Сцяпанавіцкую сельскую бібліятэку на дзень імянінніка “В кругу друзей” .** Песнямі і  пажаданнямі моцнага здароўя, добрага настрою, актыўнага даўгалецця павіншавалі ўдзельніцу клуба Р. П. Лаўренаву з 70-ці годдзем.




**28 сакавіка** бібліятэкар Даўгапольскай сельскай бібліятэцы правяла **літаратурную віктарыну** “**Идём мы в гости к братьям Гримм**”. Разам з бібліятэкарам юныя чытачы здзейснілі падарожжа ў свет дзіўных казак нямецкіх пісьменнікаў братоў Грым. Удзельнікі даведаліся біяграфію казачнікаў і самі распавялі якія казкі  гэтых аўтараў яны чыталі. Затым усе разам адгадвалі казкі па карцінках, называлі герояў казак па апісанні. Бібліятэкар аформіла невялікую кніжную выставу “**Мир сказок братьев Гримм**”, якую з цікавасцю разглядалі маленькія чытачы. Кнігі, якія іх зацікавілі прысутныя ўзялі дадому пачытаць.

**29 сакавіка** бібліятэкар **Сцяпанавіцкай сельскай бібліятэкі** правяла для дзяцей **пазнавальна-гульнявую праграму “Будем с книгами дружить”.** У час мерапрыемства з дзецьмі паўтарылі правілы абыходжання з кнігай. “Вылечылі хворыя кнігі” з дапамогай клею, скотчу, паперы. Даведаліся пра такія тэрміны, як пераплёт, вокладка. Дзеці прынялі таксама ўдзел у конкурсе “Музыкальный”, у гульні “Замиралки”, успомнілі прыказкі і прымаўкі пра кнігу, разыгралі сценку “Две книги”.

**30 сакавіка** ў рамках **міні-праекта “Нескучные каникулы”** у **Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэцы** прайшло **завочнае эка-падарожжа “Памятники природы Езерища”**. Яно адбылося для ўдзельнікаў экалагічнага клуба “Лесавичок”. На працягу мерапрыемства бібліятэкар пазнаеміла дзяцей з самымі цікавымі месцамі прыроды роднага паселка. Навучэнцы даведаліся аб асаблівасцях арніталагічнага заказніка, які знаходзіцца на тэрыторыі пасёлка. Падчас падарожжа дзеці прынялі ўдзел у некалькіх віктарынах і гульнях. А ў канцы ўсе разам паглядзелі **відэа-ролік “Сэрцу мілая старонка”.**

**30 сакавіка** ў рамках праекту “Мир пернатых и зверей ждёт поддержки от друзей”, які рэалізуецца ў **Дубраўскай сельскай бібліятэцы,** сярод маленькіх чытачоў адбыўся **конкурс малюнкаў “Знакомьтесь!Мой питомец”.**



У сакавіку ў **Руднянскай бібліятэцы-клубе** з удзельнікамі клуба “Мои года – моё богатство” прайшла **гадзіна ўспамінаў** “**В моём селе – моя судьба”. Прысутныя** ў цёплай і ўтульнай абстаноўцы дзяліліся ўспамінамі пра тое, як прайшло іх дзяцінства і юнацтва ў роднай вёсцы, як яны гадавалі сваіх дзяцей, жылі і працавалі. Бібліятэкар правяла жартоўную віктарыну, успомніўшы цікавыя моманты з гісторыі родных мясцін.

**31 сакавіка** ў рамках краязнаўчага праекту “Дарагі сэрцу куток” бібліятэкары **Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэкі** правялі **гадзіну памяці “Монументы мужества и славы”.** На мерапрыемстве прысутнічалі навучэнцы ДУА “Езярышчанская сярэдняя школа ім. П. Э. Анціпава”, а таксама госці з г. Городка і г. Невеля. Прысутныя даведаліся чаму ў пасёлку ўсталяваны памятнік танку Т-70. Менавіта гэтая машына была адной з 16-ці, якія прымалі ўдзел у вызваленні Езярышча ў 1943 годзе. Госці з Расіі атрымалі на памяць аб Езярышчы буклеты “Здесь всему начало” з інфармацыяй аб гісторыі паселка.

У Бычыхінскай сельскай бібліятэцы (душэўная размова ”Дорогой спасения“) і Езырышчанскай гарпасялковай бібліятэцы (духоўна-адукацыйная сустрэча ”**Живое слово мудрости духовной**“), адбыліся сустрэчы для пажылых людзей са старшынёй арганізацыі грамадскага аб’яднання Гарадоцкага раёна "Беларускае аб’яднанне інвалідаў” Ільыным В. А. Вячаслаў Аляксандравіч таксама супрацоўнічае з храмам Святой Жываначальнай Тройцы і вядзе вялікую работу па праваслаўнай асвеце. Гаворка ішла аб дзейнасці аб’яднання і разнастайнасці праваслаўнай літаратуры. Уздымалася і тэма псеўдарэлігійнай літаратуры, былі названы прыкметы, па якіх кожны мог зразумець, якая літаратура ўхваляецца царквой, а якая не. Таксама многія задавалі пытанні аб праваслаўнай рэлігіі, госць мерапрыемства растлумачыў некаторыя адрозненні і асаблівасці рэлігій, якія знаходзяцца на тэрыторыі Гарадоцкага раёна.

У час вясновых школьных канікул бібліятэкарамі **аддзела дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** быў арганізаваны Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі. Адкрыццё тыдня адбылося **28 сакавіка** ў літаратурна-музычнай гасцёўні, дзе адбылася **літаратурная сустрэча “Дед Природовед о тайнах и загадках природы”** з удзелам вядомых аршанскіх пісьменнікаў, членаў Віцебскага абласнога аддзялення “Саюз Пісьменнікаў Беларусі” Галінай і Сяргеем Трафімавымі. На мерапрыемстве пісьменнікі ў гульнявой форме расказалі дзецям пра свае кнігі, а дзеці вельмі актыўна і з задавальненнем адказвалі на пытанні, спрабуючы разам з аўтарамі разгадаць загадкі прыроды. Сустрэча прайшла ў шчырай, цёплай і сяброўскай атмасферы. А напрыканцы ўсе прысутныя маглі атрымаць аўтографы любімых пісьменнікаў і сфатаграфавацца з імі на памяць.





На працягу тыдня прайшло шмат і іншых дзіцячых мерапрыемстваў: **літаратурная гульня** “**Затейники и фантазёры**”, **гульнявая праграма** “**В дружбе наша сила**”, **літаратурнае свята** “**Девчонки и мальчишки – все на свете любят книжки**”, **літаратурная гульня** “**Путешествие по сказкам**”. Былі паказаны два **лялечныя спектаклі:** “**Кот, Петух и Лиса**”, “**Подарок для солнышка**”. Афармляліся **кніжныя выставы: “Мир вокруг большой и разный”, “В стране забытых книг”, “Весёлая страна Николая Носова”,** а таксама ўсе маленькія чытачы маглі зрабіць яркія фатаграфіі ў **фотазоне** “**Чтение поднимет тебя до небывалых высот**”.

На ўрачыстае закрыццё Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі “**Книжкины именины**” юныя чытачы сабраліся **31 сакавіка** ў ДУК “Гарадоцкі гарадскі Дом культуры”. Тут бібліятэкары **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** арганізавалі сапраўднае свята з казачнымі героямі, шумнымі гульнямі і песнямі. Ганаровым госцем мерапрыемства стала вядомы пісьменнік, член Саюза пісьменнікаў Беларусі і Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы, аўтар дзіцячай кніжнай серыі вершаў “Наша дружная сям'я” – Ірына Андрэеўна Багданава. Таксама прайшло ўзнагароджанне пераможцаў **дзіцячага конкурсу на лепшага чытача беларускай кнігі “З родным словам, ды з беларускаю душою”** і **раённага літаратурнага конкурсу “Слаўлю цябе, беларуская мова”.** Падарункі канкурсантам прадаставіла Гарадоцкая раённая арганізацыя рэспубліканскага грамадскага аб'яднання “Белая Русь”.








КНИЖКИНЫ
ИМЕНИНЫ